Рэха фестывалю

# Грэў сэрца радок вершаваны

**У рамках фестывалю нацыянальных культур у Гродне ва ўтульнай Малой зале абласнога драматычнага тэатра адбылося свята нацыянальнай паэзіі “Кожны народ песняра свайго мае”.**

Першым настроіў гледачоў на лірычную хвалю дзявочы карагод з Гродзенскай гімназіі № 5. Пасля танцавальнай кампазіцыі зачаравала залу спявачка, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Галіна Качалава. Яна пранікнёна выканала песні “Мой родны кут, як ты мне мілы...” і “Спадчына” на словы беларускіх песняроў Якуба Коласа і Янкі Купалы, 130-гадовымі юбілеямі якіх асвечаны многія сёлетнія мерапрыемствы.

А затым прыйшла чарга даць слова гасцям. Са стосам кніг паднялася на сцэну прадстаўніца рускага таварыства з Брэста Любоў Красеўская. Яна ўручыла па экзэмпляру новага рускага калектыўнага зборніка гродзенскім аўтарам і пачытала свае вершы.

Цудоўную кнігу “Гродна. На заходняй мяжы Айчыны” прэзентаваў на свяце паэзіі і Навум Гальпяровіч. Свае вершы прачытала прадстаўніца ўкраінскай суполкі з Віцебска Аляксандра Краўчанка. Асалоду слухачы атрымалі ад выступленняў творцаў іншых нацыянальнасцей, асабліва літоўкі Алены Чэпукенэ і дагестанца Хізры Асадулаева.

Спектаклем, сюжэтнай лініяй якога была вернасць радзіме, парадаваў гледачоў яўрэйскі тэатр “Шалом”. Асобных словаў падзякі ад удзельнікаў свята заслужыла выстава кніг у фае Малой залы тэатра, якую падрыхтавала Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага пад назвай “Сонцам свеціць Прынямонне”.

**Тамара МАЗУР.**